ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

24 кастрычніка 1931 г. № 24? (1517)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Рашуча ўдарыць па опортуністычнай практыцы і рвацкіх тэндэнцыях у загатоўках

Каля 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў колгасы. Саўгасы і колгасы зараз ужо асноўныя вытворцы с.-гаспадарчай продукцыі, а гэта дае поўную магчымасьць пасьпяхова і своечасова выконваць загатоўкі. Раёны, якія па-бальшавіцку разгарнулі масавую палітычную работу вакол загатовак, дабіліся перамогі. Пляны загатовак, выпрацаваныя на аснове посьпехаў у сацыялістычнай рэконструкцыі с.-гаспадаркі, ня толькі рэальныя, але пры добрай рабоце могуць быць перавыкананы.

Перад намі пастаўлена задача: да канца кастрычніка дабіцца 55 проц. выкананьня гадовага пляну загатовак. Аднак, паасобныя арганізацыі зусім марудна праводзяць загатоўкі. На 15-е кастрычніка плян збожжазагатовак па БССР выкананы толькі на 33,9 проц., бульбы—на 44,4 проц. Але ёсьць раёны, дзе гэты процант значна ніжэйшы. Тураўскі раён збожжазагатоўкі выканаў на 8,7 проц., Клічаўскі—на 9,2 проц., Асіпавіцкі—на 9,7 проц. Комсамольскія арганізацыі гэтых раёнаў бязьдзейнічаюць, не мобілізавалі колгасьнікаў і колгаснае моладзі на выкананьне пляну загатовак, не зразумелі новых абставін і новых умоў, у якіх мы праводзім зараз загатоўкі, а асабліва іх у тым, што вядучая роля ў загатоўках належыць саўгасам і колгасам. Па гэтаму патрэбна асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізацыю загатовак у саўгасах і колгасах.

Аднак, паасобныя колгасы апынуліся ў глыбокім тыле загатоўчага фронту, бо кулацкія элементы выкарыстоўваюць дробнаўласьніцкія і рвацкія тэндэнцыі адсталых колгасьнікаў. Гэта знаходзіць свой адбітак на ўтайцы хлеба пад шыльдамі розных фондаў, пераўмяншэньні сапраўднай яго наяўнасьці ў колгасах, пераўвялічэньні ўнутраных патрэб колгасу, даходзячы нават да яўнага абману і захоўваньня хлеба ад хлебаздачы. (Віцебск, колгас „Ідэя“).

Аднаасобны сэктар адыгрывае яшчэ вялікае значэньне ў выкананьні пляну загатовак. Неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную і масавую работу, дабіваючыся каб аднаасобны сэктар своечасова выконваў пляны.

Комсамол зараз павінен максімальна павысіць класавую пільнасьць, рашуча выступіць супроць праваопортуністычнай практыкі на справе, супроць рвацкіх настрояў адсталай масы колгасьнікаў.

Комсамольскія ячэйкі павінны быць авангардам правільнасьці расстаноўкі сіл у колгасах з тым, каб на авангард і загатоўкі былі кінуты лепшыя сілы колгасу. Ударныя брыгады на малацілках, ударныя транспартныя брыгады збожжа—вось конкрэтныя шляхі ўдзелу ў прысьпешваньні тэмпаў загатовак.

Разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу, змагаючыся за выкананьне лёзунгу партыі: „Ні воднага цэнтнэра прыватніку“.

Дэлегацыя саксонскай комсамоліі прыедзе к нам сьвяткаваць 14-ю гадавіну Кастрычніка

Соцыял-фашысцкаму соцмолу ня ўдасца разьбіць фронт інтэрнацыянальнай солідарнасьці між працоўнай моладзьдзю Нямеччыны і СССР

БЭРЛІН, 22. Па запрашэньню беларускіх комсамольцаў 30 кастрычніка выяжджае ў Савецкі Саюз дэлегацыя моладзі Саксоніі для ўдзелу ў сьвяткаваньні гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі. У Рурскай вобласьці таксама рыхтуецца да ад'езду ў СССР дэлегацыя рабочай моладзі.

Акруговы камітэт соцыялістычнай моладзі Заходняга раёну Нямеччыны вылучыў у дэлегацыю для паездкі ў Савецкі Саюз свайго прадстаўніка Германа. Цэнтральны камітэт соцыялістычнай моладзі, даведаўшыся аб гэтым, накіраваў Герману ліст, у якім патрабуе адмовіцца ад паездкі і пагражае ў процілеглым выпадку выключыць з саюзу. На пасяджэньні камітэту Паўночна-Заходняга раёну, Уадказ ЦК соцыялістычнай моладзі, прынята рэзолюцыя, якая заяўляе, што, ня гледзячы на пагрозы, Герман паедзе ў Савецкі Саюз.

Гэты крок соцыялістычнай моладзі паказвае, як расьце сярод шырокіх мас соцыял-дэмократычнай моладзі незадавальненьне палітыкай кіраўніцтва соцыял-дэмократычнай партыі, у асаблівасьці яго палітыкай у адносінах да СССР.

Надзвычайнае ўзбурэньне рабочых з прычыны браўншвэйскіх падзей

БЭРЛІН. У апошніх кварталах Браўншвэйгу пануе надзвычайнае ўзбурэньне з прычыны апошніх фашысцкіх налётаў. Рабочы актыў буйнага прадпрыемства „Міаг“ пастанавіў аб'явіць у знак пахаваньня забітых фашыстамі рабочых стачку протэсту і прыняць удзел у пахаваньні. Падобнае рашэньне прыняла таксама рабочы савет машына-будаўнічага заводу і агульны сход рабочых комунальных прадпрыемстваў. Акруговы камітэт КПН у Саксоніі у пачатку зьвярнуўся з адозвай, заклікае рабочых Ніжнай Саксоніі пасьледаваць прыкладу Браўншвэйскіх прадпрыемстваў. Паліцыя непакоіцца у сувязі з настроямі ў раёне ўсходніх кварталаў.

20 кастрычніка адбылася спэцыяльная нарада, на якой абмяркоўвалася пытаньне аб паліцэйскіх мерапрыемствах. У нарадзе прынялі ўдзел Грэнэр (ваенны міністар і адначасова міністар унутраных спраў), міністар унутраных спраў Прусіі Зэверынг і генэрал рэйхсвэру Шлэйхер.

Начальнік паліцыі забараніў дэмонстрацыю

БЭРЛІН 22. Начальнік паліцыі Бэрліна соцыял-дэмократ Гжэзінскі забараніў назначаную компартыяй на 23 кастрычніка дэмонстрацыю протэсту супроць фашысцкіх ахвяр у Браўншвэйгу, і заявіў, што аб дазволе на гэту дэманстрацыю „ня можа быць і гутаркі“.

Паліцэйскія рэпрэсіі ў Нямеччыне

БЭРЛІН. У апошнія дні значна ўзмацніліся паліцэйскія рэпрэсіі. Учора ў Гальле шматлікі атрад паліцыі ўварваўся ў памяшканьне партыйнага сэкрэтарыяту і зрабіў пільны вобыск, вышукваючы агітацыйную літаратуру. Такі-ж налёт на комуністычную організацыю быў зроблен у Брэмэне, дзе была канфіскавана нават брошура, выданая нямецкай соцыял-дэмократыяй 30 гадоў назад. У Дрэздэне паліцыя зрабіла вобыск у бюро МОПР Вобыск ня даў ніякіх вынікаў, паліцыя конфіскавала некалькі пішучых машынак. У Шэмніцы зроблен вобыск у памяшканьні партыйнага складу літаратуры. У Бэрліне конфіскавана брошура Нэймана „Праз адзіны фронт да ўлады“ і прамова Тэльмана „Чырвоны Гамбург за Савецкую Нямеччыну“.

Суровы прысуд над 5 комсамольцамі

Рыга. Рыскі акруговы суд вынес нячуваны па сваёй суровасьці прыгавор па справе 5 комсамольцаў, абвінавачваных у распаўсюджваньні нелегальнай літаратуры і падрыхтоўцы першамайскай дэмонстрацыі. Суд прыгаварыў аднаго комсамольца да 6-ці гадоў катаржных работ, 2-х да 4-х гадоў катаргі, 1-го—да 3-х гадоў.



Японекія солдаты на тэрыторыі акупаванай Манчжурыі.

Ператварыць у конкрэтныя справы баявую програму ўзмацненьня работы комсамолу на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ аб мерапрыемствах па правядзеньню двухмесячніка беларусізацыі

З мэтай узмацніць тэмпы беларусізацыі ў комсамольскай організацыі, пастановай трэцяга кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ з 1-га лістапада аб'яўлен двухмесячнік беларусізацыі. Прыдаючы гэтаму мерапрыемству вялікае значэньне, Бюро ЦК у якасьці практычных мерапрыемстваў высоўвае наступнае:

1) У час двухмесячніка павінен быць разгорнуты шырокі добраахвотніцкі рух за аўладаньне і вывучэньне беларускае мовы рабочай моладзьдзю і комсамольцамі, паклаўшы ў аснову вопыт заводу імя Варашылава.

2) Дабіцца організацыі гурткоў па вывучэньню белмовы, гісторыі і экономікі Беларусі ва ўсіх цэхах, прадпрыемствах і ўстановах, дабіваючыся ахопу гэтымі гурткамі ўсіх комсамольцаў.

3) За час двухмесячніка неабходна дабіцца поўнага пераводу на белмову работы ўсіх ячэек і камітэтаў, за выключэньнем ячэек, якія працуюць на мовах нацменшасьцяй.

4) Комсамольскім організацыям наладзіць і конкрэтна ажыцьцявіць кантроль і праверку ступені беларусізацыі савецкага гаспадарчага апарату.

5) Максімальна павінна быць разгорнута работа па ўкараненьню сярод комсамольцаў, рабочае моладзі і рабочых беларускае пролетарскае літаратуры і беларускага друку.

6) Лічыць неабходным для кіраўніцтва двухмесячнікам скласьці опэрацыйную пацёрку пры ЦК у складзе: Рубінчыка, Гольдмана, Анісава, прадстаўніка ад культпропу ЦК КП(б)Б і нац. камісіі ЦВК. Пры ўсіх ГК і РК стварыць опэрацыйныя друк. тройкі, на якіх ускласьці адказнасьць за правядзеньне двухмесячніка.

7) Прапанаваць усім ГК і РК зараз-жа разгарнуць належную падрыхтоўчую работу па правядзеньню двухмесячніка, мобілізуючы савецкапролетарскую грамадзкасьць вакол задач, пастаўленых двухмесячнікам.

8) ЦК падкрэсьлівае, што 2-х месячнік павінен садзейнічаць узмацненьню работы комсамолу на фронце нацыянальнага і культурнага будаўніцтва, побач з правядзеньнем 2-х месячніка беларусізацыі павінна быць узмоцнена работа сярод працоўнай моладзі нацменшасьцяй, асабліва польскай.

9) Улічваючы, што мінулы месячнік беларусізацыі ня быў даведзены да канца з прычыны недацэнкі яго радам організацый, папярэдзіць усе організацыі комсамолу аб неабходнасьці ўдзяліць максімум увагі гэтаму 2-х месячніку, недапускаючы зводзіць яго да чарговай кампаніі.

10) Аддзелу адукацыі і быту ў час 2-х месячніку правесьці агляд ня менш 10 раёнаў і накіраваць у дапамогу РК 7-8 брыгад дзеля ажыцьцяўленьня опэрацыйнага кіраўніцтва 2-месячнікам, устанавіць дэкадныя зводкі РК з апублікаваньнем іх у „Ч. З.“. Прапанаваць „Чырвонай зьмене“ разгарнуць шырокую падрыхтоўку і масавую работу па правядзеньню 2-месячніка.

Рэволюцыйны ўздым працоўнага сялянства ў Заходняй Беларусі

Працоўнае сялянства Заходняй Беларусі ў выніку сусьветнага крызісу знаходзіцца ў цяжкім стане беспрацоўя голаду і ўсялякіх хвароб. Вялікія штрафы, падаткі зацята зьдзіраюцца польскім урадам з сялян на ваенную падрыхтоўку, на ўзмацненьне тэрору. Масамі заганяецца сялянства на прымусовую працу—„шарваркі“, на пабудову стратэгічных ваенных дарог. Зямельная палітыка окупантаў зводзіцца да таго, што ад сялян адымаецца зямля, праводзіцца прымусовая камасацыя, ліквідуюцца сэрвітуты. Асаднікі багацеюць, яшчэ больш закабаляючы сялян, зьверскі іх эксплёатуючы.

Нацыянальны ўціск у Зах. Беларусі ў апошні час набыў нябывалыя памеры. Закрыты ўсе беларускія пачатковыя школы. Існуюць толькі дзьве „беларускія“ гімназіі, начале якіх стаяць беларускія нацыянал-фашысты. Гэтыя гімназіі скарыстоўваюцца фашысцкім урадам для прыгнечаньня нацменшасьцяй. Разгром яўрэйскага і літоўскага школьніцтва і культурна-асьветных організацый ня спыняецца. Загад міністра фашысцкай асьветы, які забараняе адчыняць на працягу 7-мі год беларускія школы, з усёй жорсткасьцю выконваецца фашысцкімі катамі, пры актыўнай дапамозе беларускага нацыянал-фашызму. Замест школ на роднай мове, будуюцца новыя турмы па апошняму слову турэмнай тэхнікі.

Працоўнае сялянства церпіць крывавы фашысцкі тэрор. Урад окупацыі і „ўціхаміраньня“ пасылае на вёскі і ў мястэчкі карныя экспэдыцыі. Сотні скатаваных кідае ў турмы, на шыбеніцы.

У адказ фашысцкаму ўраду, працоўнае сялянства організуецца і разам з пролетарыятам пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вядзе зацятую барацьбу супроць нацыянальнага і соцыяльнага ўціску, за зьвяржэньне фашысцкай окупацыі. Штодзённыя падзеі на абшарах Заходняй Беларусі—доказ гэтаму.

У вёсках Воўчынскага раёну сяляне організавалі камітэт самаабароны для барацьбы з окупантамі. У камітэтах самаабароны актыўны ўдзел прымае моладзь, як хлопцы і так і дзяўчаты. Падаткаў ня плоцяць і на прымусовыя работы („шарваркі“) ня выходзяць. У адну з такіх вёсак прыехаў быў сэквэстратар (які зьдзірае падаткі) і карны атрад паліцыі, каб забраць апісаную за падаткі маёмасьць. Сяляне, сабраўшыся грамадой, сталі гнаць каменьнем і палкамі паліцыю. У выніку сутычкі было паранена некалькі паліцэйскіх і некалькі сялян. Паліцыі усё-ж такі у вёску ўвайсьці не ўдалося. Пасьля гэтага ўночы паліцыя правяла масавыя арышты. Пачаліся страшэнныя катаваньні сялян у дэфэнзывах. Але на гэтым барацьба ня скончылася. Сялянства і надалей вядзе змаганьне з фашысцкім урадам.

У Ліншчынскім раёне падаткаў ніхто ня плоціць. У трох вёсках аддадзены на ліцытацыю ўсе сялянскія гаспадаркі за выключэньнем кулацкіх. У вёсцы Нэплі апісана 37 гаспадарак. Калі ў гэтую вёску прыехаў сэквэстратар з 12 паліцэйскімі, сяляне прагналі іх вон. На сваіх масоўках сяляне заяўляюць: „ня будзем плаціць падаткаў, будзем усялякімі спосабамі змагацца з шарваркамі, будзем змагацца з экзэкутарамі і паліцыяй!“

У вёску Осэве, Уладаўскага раёну, аднойчы прыехаў па падаткі сэквэстратар з паліцыянтамі. Сабраўшыся грамадою, сяляне прагналі іх з вёскі. Пасьля гэтага організавалі камітэт самаабароны. У Смаргонскім і Маладэчанскім раёнах становішча сялян пагаршаецца з кожным днём. Ужо доўгі час сяляне ня маюць свайго хлеба. Падаткаў і штрафаў ня плацяць зусім. Сэквэстратар і паліцыя часта іх наведвае, апісвае маёмасьць, праводзіць арышты.

У Гарадоцкім раёне большасьць сялян падаткаў ня плаціць. У вёскі Залукі сэквэстратар і паліцыя спрабавалі забраць у аднаго селяніна карову. Узброіўшыся сякерамі і каламі, вёска прагнала сэквэстратараў.

У вёску Каркавіна Раманаўскай гміны Брэслаўскага павету войт і сэквэстратар прыехалі апісваць ў сялянкі Радзевічыхі за падаткі жывёлу. Пачуўшы гэтую вестку, зьбегліся сяляне навакольных вёсак, зачынілі сэквэстратара і войта ў хлеў і пагражалі ня выпусьціць з хлява пакуль яны не адмовяцца апісваць жывёлу.

Неўзабаве прыбыў моцны атрад паліцыі і разагнаў сялян. Радзевічыху адзін паліцыянт моцна параніў штыхом у руку. Сэквэстратара і войта выпусьціла з хлява паліцыя.

Барацьбы працоўнага сялянства ўжо ня стрымаюць ніякія ілюзіі і абяцанкі фашысцкага ўраду. Яскравы прыклад падае Тараспольскі раён.

Сяляне з некаторых вёсак у свой час атрымоўвалі будаўнічы матар'ял з дзяржаўнага лесу. Даючы гэты матарыял, ўлада казала, што гэта беззваротная дапамога, цяпер кожны селянін павінен плаціць па 200-300 злотых. Сяляне катэгорычна адмаўляюцца ад выплаты.

Апрача такіх масавых актыўных выступленьняў, растуць стыхійныя выступленьні замахі на чыгунку, на чыноўнікаў, паліцэйскіх, падпалы кулацкіх і абшарніцкіх гаспадарак.

За верасень месяц было шмат такіх выпадкаў. Вось некалькі фактаў.

У вёсцы Парубянак, каля Вільні, падпалены будынкі Юзэфа Валянтовіча. Страты 2000 злотых.

У вёсцы Дэмантовічы, Клецкай гміны, спалена кулацкіх дамоў на 16 тыс. злотых. У гміне Заастравіцкай спалены будынкі вайсковага асадніка Яна Сьцяпуры, страты вылічваюцца ў некалькі тысяч злотых. У канцы лета ў вёсцы Чэрніхаў, Баранавіцкага павету, спалена 260 снапоў кулацкага аўса, які яшчэ стаяў на полі.

„Кур'ер Віленскі“ у другой палове верасьня пісаў: „у апошніх двух кварталах гэтага году на тэрыторыі Віленскага ваяводзтва спалена 290 двароў, 428 хат, 30 складаў і прыбудовак, 9 лазьняў, 9 хат лясьнікоў і 950 га дзяржаўнага лесу. Страты вылічваюцца ў 6 мільёнаў злотых“. Вялікая колькасьць з гэтых пажараў прыпадае на падпалы.

Працоўныя масы Заходняй Беларусі з кожным днём усё больш рэволюцыянізуюцца і выступаюць у рашаючыя бойкі пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, супроць фашысцкага тэрору Пілсудзкага, за поўнае вызваленьне.

Ю. Т

КОМСАМОЛ АБАВЯЗАЎСЯ
і даб'ецца тоны--апаросу

Змагацца за высокую таварнасьць социялістычнай сьвінагадоўлі

Сьвінагадоўлю—у цэнтр увагі комсамолу

Буйнейшы сьвінасаўгас Вялень-Сінча (Пухавіцкі р-н) сарваў плян укомплектаваньня сьвінога гурту. Замест патрэбных, згодна пляну ўкомплектаваньня, 1700 штук сьвіней саўгас набыў усяго 1000 штук. Злучная кампанія таксама праходзіць надзвычай марудна. З 662 сьвінаматак у кастрычніку трэ' было пакрыць 136 штук, а пакрыта толькі 80.

Комсамольская ячэйка саўгасу налічвае 35 чал., але на сьвінарніках працуе толькі 3 комсамольцы. Ячэйка ня кінула комсамольскіх сіл на рашаючыя вучасткі работ, не расставіла комсамольскіх сіл ў сьвінагадоўчых цэхах.

У саўгасе „Вялень" комсамольцы ня ведаюць паказчыкаў прамфінпляну, ня ведаюць за што конкрэтна яны павінны змагацца. Шчыльна да гаспадарчых пытаньняў комсамол саўгасу яшчэ не падышоў.

Вялікі і самы асноўны недахоп у рабоце саўгасу па падрыхтоўцы да зімы крыецца ў недаацэнцы гэтага важнейшага мерапрыемства, спадзяваньні на самацёк, імкненьні падмяніць практычную работу агульнымі разважаньнямі і прыгожымі рэзолюцыямі.

Буйнейшы недахоп у працы сьвіной гаспадаркі—дрэннае ўкомплектаваньне гурту. Гэта рашаючы недахоп, які можа прывесьці да вялікага недабору пагалоўя і таварнай продукцыі. Дрэнная організацыя працы, абязьлічка—гэты зьлейшы вораг сьвінагадоўлі, яшчэ маюць у саўгасе прытулак. Нагіядаецца вялікая цякучасьць рабочай сілы.

Усё гэта даволі характарызуе працу грамадзкіх організацый саўгасу і коопэрацыі, якая фактычна ня стала цэхам сьвінагадоўчай вытворчасьці.

Комсамол саўгасу „Вялень" цягнецца ў хвасьце ўсёй саўгаснай масы, ён не павярнуўся яшчэ тварам да рашаючай, вядучай галіны вытворчасьці—сьвінагадоўлі. Зусім ня дзіва, што комсамольская ячэйка саўгасу, дзе працуе 100 ч. моладзі, за чатыры месяцы вырасла ўсяго на 4 чалавекі.

Зараз саўгасу ў першую чаргу трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўкомплектаваньне гурту, на злучную кампанію, на захаваньне пагалоўя маладняка—тут для комсамолу адчыняецца вялікае поле практычнай дзейнасьці. Комсамол павінен устанавіць самы жорсткі кантроль над выдаткаваньнем кармоў, якіх можна зэканоміць ня менш 10-15 проц. не зьмяншаючы норм кармленьня сьвіней.

Ацяпленьне сьвінарнікаў яшчэ не пачата. А з такімі сьвінарнікамі прыйсьці да зімы, гэта значыць загубіць увесь сьвіны гурт.

Комсамольская ячэйка павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на організацыю працы сьвінагадоўчага цэху і аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі, што забясьпечыць дадатныя вынікі ў барацьбе за тону-апарос.

В. С.

Прыклад браць з перадавых

Слуцак. Укомплектаваньне СТБФ па Слуцкім раёне праводзіцца здавальняюча. Плян на 10-е кастрычніка выкананы на 60 проц. Многія колгасы паказваюць бліскучыя ўзоры бальшавіцкай работы ва ўкомплектаваньні сьвінагадоўчых таварных фэрм.

Колгас „Карла Маркса" выканаў плян на 91,6 проц., колгас „Случ" на 104 проц., „Батрак" на 106 проц., „Чырвоны Маяк" № 1 на 146 проц.

Гэтыя колгасы ідуць першымі ў раёне па ўкомплектаваньню сьвінога гурту. Партыйныя ячэйкі гэтых колгасаў па-бальшавіцку змагаюцца за разгортваньне социялістычнай сьвінагадоўлі.

У гэтых колгасах уведзена зьдзельна-прэміяльная аплата працы па догляду сьвіней. Догляд сьвіней добры. Маладняк знаходзіцца ў чыстых, цёплых памяшканьнях.

Плятуцца ў хвасьце ўкомплектаваньня колгасы: „Беларуская Зара" (плян выканан на 8,3 проц.), „Бальшавік" (16 проц.), „Шлях Ільіча" (16 проц.)

Партыйна-комсамольскія ячэйкі гэтых колгасаў не перабудавалі сваёй работы, не ўвязалі яе з барацьбой за вядучую галіну гаспадаркі свайго раёну.

Адстаючыя колгасы, вазьмеце прыклад з перадавікоў! Плян укомплектаваньня СТФ не павінен зрывацца, яго трэба выканаць цалкам.

Брыгада „Ч. З."
П. Бранавец. С. Статкевіч

Дадзь сьвіньні цёплае памяшканьне

Колгас „Асьвета" Любанскага раёну—самы моцны ў раёне. Колгас павінен быў укомплектаваць сваю гаспадарку 200 сьвінаматкамі, зараз у наяўнасьці 193, альбо 96 проц. заданьня.

З будаўніцтвам сьвінарнікаў справа горш. Для 50 сьвінаматак прыстасаваны старыя будынкі, для рэшты сьвінарнікі яшчэ ня скончаны. Галоўная затрымка і перашкода ў будаўніцтве—гэта адсутнасьць цьвікоў.

Адным з дрэнных момантаў сьвінагадоўлі ў колгасе зьяўляецца дрэнны догляд сьвіней, падчыстка, сваячасовая падсьцілка і інш. Сьвіньні трымаюцца ў брудных сьвінарніках.

Комсамольскі колектыў „Асьветы" мобілізаваўся на барацьбу за організаваную сустрэчу зімы і атрыманьне тоны мяса ад кожнага апаросу ў 6-ці месячным узросьце.

Колектыў вынес некалькі пастаноў аб мобілізацыі 4-х комсамольцаў на працу ў сьвінарнікі, пастановы і па сёньня ня выкананы, хаця ў доглядзе за сьвіньнямі вялікі прарыў.

Каб пасьпяхова правесьці ў жыцьцё лёзунг „тона-апарос" організавана сустрэць зіму, неабходна мобілізаваць масы комсамольцаў і колгасьнікаў. Ніводзін комсамолец не павінен стаяць у баку ад гэтай вялікай справы.

Хайкін і Дарэўскі

Драцца за кожнае парасё

Комсамольская ячэйка пры колгасе „Комсамолец" Любаньскага раёну ўключылася ў 2-х месячнік штурму прарываў у сьвінагадоўлі.

Ячэйка вылучыла 2-х комсамольцаў на працу ў сьвінарнікі для ўзмацненьня сьвінагадоўчага цэху. Акрамя гэтага організавана юнкораўская брыгада.

У колгасе зусім дрэнна з укомплектаваньнем сьвінога гурту.

Па пляну намечана 100 сьвіней, а ўкомплектавана ўсяго 43, што тлумачыцца слабою працай комсамольскай ячэйкі і адсутнасьцю масавай растлумачальнай работы ў гэтай галіне.

Двухмесячнік штурму павінен быць даведзен да канца. Патрэбна будзе ячэйцы безадкладна правесьці работу па ўкомплектаваньню сьвіней, уцягнуўшы ў яе ўсіх колгасьнікаў і комсамольцаў.

Х. Д.

Да політнавучальнага году на вёсцы

НАСТУПАЮЦЬ РАШАЮЧЫЯ ДНІ

Ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку—ворагаў політвучобы

Праз тры тыдні павінны распачацца політзаняткі ў вясковай частцы організацыі. Політсетка гэтага году павінна ахапіць дзесяткі тысяч новых комсамольцаў, якія ў апошнія м-цы ўліліся ў рады нашага саюзу. Дні, што засталіся да пачатку заняткаў, павінны зьявіцца рашаючымі днямі падрыхтоўкі. Ад таго наколькі ў гэтыя дні разгорнем падрыхтоўчую работу будзе залежаць посьпех і якасьць нашай вучобы.

Зьмешчаны сёньня матэр'ял з раду організацый сыгналізуе аб наяўнасьці бясчынных (за рэдкім выключэньнем) фактаў у стане політвучобы. Опортуністычная недацэнка, ураўнілаўка і абязьлічка прывялі да таго, што многія політгурткі разваліліся, а ў горшым выпадку працуюць з вялікімі перабоямі.

У гэтым годзе мы ні ў якім разе не павінны дапусьціць летаяшніх прарываў.

Праз політ-баі, гутаркі трэба неадкладна распачаць праверку таго, наколькі усвойваецца політмінімум; організаваць і ўкомплектаваць політшколы забясьпечыць падручнікамі і г. д.

Асаблівае значэньне ў справе вучобы—гэта кадры. Трэба найхутчэй скончыць работу курсаў па падрыхтоўцы выкладчыкаў, правесьці строгі і дасканалы вучот актыву, комсамольцаў-настаўнікаў, для скарыстаньня іх у якасьці выкладчыкаў політсетак.

Колькі сыгналаў вам патрэбна?

„Чырвоная Зьмена" ужо два разы сыгналізавала аб тым, што політмінімум у Стара-Дарожскай організацыі ганебна зрываецца. Але кіраўніцтва райкому комсамолу падобныя сыгналы друку не пачула.

Політгурткі пры ячэйках не працуюць. Дрэнна пастаўлена політвыхаваньне навічкоў, яны політычна-няпісьменныя. Але гэта, відаць, зноў такі не справа райкому.

У райкоме комсамолу валяецца не разасланая па ячэйках літаратура па політвучобе.

Райком комсамолу не займаецца выяўленьнем конкрэтных прарываў у політмінімуме. Дырэктывы аб зімовай політвучобе ячэйкам таксама яшчэ не дадзены.

Мы пытаем Стара-Дарожскі райком комсамолу: ці доўга ён будзе ігнараваць сыгналы друку?

РК КП(б)Б павінен неадкладна зацікавіцца кіраўніцтвам райкому комсамолу, які ігноруе політвыхаваньне шырокіх комсамольскіх мас і працоўнай моладзі.

Брыгада „Ч. З." **Мацько, Харытановіч.**

Яўна нездавальняюча

Комсамольская політвучоба, як і партыйная, па Слуцкім раёне разгортваецца яўна нездавальняюча.

Дырэктывы ЦК комсамолу аб пачатку вучобы ў гарадзкой сетцы з першага кастрычніка ня выконваюцца. Такое становішча і з партвучобай. Зімовай вучобы і комплектаваньня партсетак не пачыналі. Партыйныя ячэйкі не зьвяртаюць належнай увагі на гэту важнейшую задачу.

Брыгада „ЧЗ" **Статкевіч, Баранавец.**

СЫГНАЛЫ ПАЧУТЫ

Завод „Комунар" уключыўся ў сталінскую пуцёўку

Комсамольцы „Ударніка" і „Варашылава", прымеце выклік на соцспаборніцтва

Абавязуюцца і выклікаюць

Пасьля сыгналу „Чырвонай зьмены" колектыў заводу „Комунар" разгарнуў сапраўдную работу па рэалізацыі шасьці маршрутаў сталінскай пуцёўкі.

Праверяецца фактычнае выкананьне соцдагавору з заводам імя Калініна (Заходняя вобласьць). Намечана перавесьці рад брыгад і варштатаў на гаспадарчы разрахунак. Так, у сьлясарным цэху пераводзяцца чатыры брыгады, у такарным шэсьць варштатаў, у кавальным будуць пераведзены 5 горнаў. Сіламі комсамольцаў вызначана сабраць к 14 гадавіне Кастрычніка 75 рабочых прапаноў.

Устанаўліваецца комсамольскі кантроль над укараненьнем электразваркі і пераводу нагрэву заклепак на электра-энэргію.

На заводзе організаваны вучэбны комбінат, які ахоплівае 220 чал. комсамольцаў і рабочай моладзі. Не ахопленыя комбінатам комсамольцы вучацца ў рабфаках, тэхнікумах і ВНУ. Пераходзячы на гаспадарчы разрахунак, брыгады адначасова пераводзяцца на прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну. Усёй работай па ажыцьцяўленьню сталінскай пуцёўкі кіруюць тройкі.

21 кастрычніка на заводзе адбылася конфэрэнцыя комсамольцаў і рабочай моладзі заводу, дзе абгавора на пытаньне аб сталінскай пуцёўцы і перавыбарах заўкому.

Па гэтых двох пытаньнях конфэрэнцыя прыняла наступнае: організаваць штурмавую брыгаду па праверцы работы заўкому, уцягнуць усіх рабочых заводу ў члены профсаюзу, ліквідаваць запазычанасьць па сяброўскіх узносах, праверыць стан ударніцтва, уцягнуць новых ударнікаў і выявіць ілжэ-ўдарнікаў.

Конфэрэнцыя ўзяла на сябе абавязак уцягнуць праз індывідуальны адбор усе 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол, лепшых комсамольцаў-ударнікаў перадаць у партыю.

Кожны комсамолец, кожны малады рабочы павінен даць адну рабочую прапанову. Па ўсіх гэтых пытаньнях і па ажыцьцяўленьню сталінскай пуцёўкі колектыў выклікае на соцспаборніцтва колектывы ЛКСМБ заводу Варашылава і заводу „Ударнік"

Сакратар колектыву **Энгельсон**

Вакол пуцёўкі праведзена масавая работа ў цэхах

Комсамольскі колектыў запалкавай фабрыкі „Везуві" (Гомель) уключыўся ў правядзеньне сталінскай пуцёўкі. 18-га адбылася нарада комсамольскага актыву фабрыкі, якая абгаварыла практычныя шляхі ажыцьцяўленьня сталінскай пуцёўкі. Вылучаныя організатары правялі масавую работу ў брыгадах і групах па растлумачаньню сутнасьці пуцёўкі.

Колектыў рыхтуе сумесны вечар з адным з комсамольскіх колектываў Гомеля па пытаньню рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Шапіра.

Абязьлічка зрывае політвучобу

Комсамольскія ячэйкі колгасаў „Барацьба", імя Калініна, „Пяцігодка", „Сталіна" (Капыльскага р-ну), праваліўшы летні політмінімум, не распачалі ніякай падрыхтоўкі да зімовай політвучобы.

Прычына зрыву — панаваньне абязьлічкі, як у ячэйках, так і ў РК ЛКСМБ.

Салагуб.

Вучыліся без перабояў

Організаваная ў ліпені месяцы комсамольская ячэйка пры колгасе „Чырвоны бор", Слуцкага раёну, паказала ўзорную прапрацоўку політмінімуму. Ячэйка пад кіраўніцтвам настаўніка-комсамольца т. Валуба займалася два разы ў тыдзень. Зрываў і перабояў у занятках не было. Ячэйка выйшла пераможцаю ў політбаі з другой колгаснай ячэйкай. Зараз ячэйка пачала падрыхтоўку да зімовай політвучобы; школа ўкомплектавана комсамольцамі і колгаснай моладзьдзю.

Капцэвіч Д.

Ня ўлічылі глыбокі прарыў

У ячэйках мястэчка Крупкі пануе поўная ўраўнілаўка ў правядзеньні політмінімуму. Дзьве групы праз нейкі час зьліліся ў адну. Хутка пачаўся вялікі адсеў бо ў групе, побач з політычна моцнымі, былі зусім няпісьменныя комсамольцы. Элемэнты тэхнікі ня ўнесены ў програму політшкол. Школы не забясьпечаны літаратурай і падручнікамі. Заняткі наведвала зусім мізэрная частка комсамольцаў. З 70 чалавек рэгулярна хадзілі толькі 15-20 чал. Беспартыйнай моладзі на занятках ня было. Заняткі часта зрываліся. За апошні час політшкола зусім не займаецца. Бюро комсамольскіх ячэек і РК ЛКСМБ не пастараліся забясьпечыць нормальную работу школы.

Політбой паказаў вельмі дрэнную прапрацоўку політмінімуму.

Ні на адно запытаньне ня было правільнага адказу. Нават на пытаньне: „Што павінен рабіць комсамолец у колгасе?" некаторыя не маглі адказаць. Падрыхтоўка самога політбою праводзілася габінэтным парадкам, аб ім ня ведалі ня толькі комсамольцы, алё і сакратары ячэек. Згодна рашэньня РК КСМ у політбоі павінны былі прыняць удзел чатыры ячэйкі, а ўдзельнічалі толькі дзьве. З 70 чал. местачковых ячэек зьявілася на політбой толькі 35.

Такое-ж становішча, калі ня горшае, у вясковых ячэйках.

Да новага політ-навучальнага году організацыя зусім не падрыхтавалася. Яшчэ не ўстаноўлена сетка політшкол, не заказаны падручнікі, політшколы не ўкомплектаваны комсамольцамі і беспартыйнай моладзьдзю.

Райком комсамолу павінен прыняць рашучыя захады.

Цынман.

Прапойскае аддзяленьне ДВБ зрывае забясьпечаньне падручнікамі

Прапойская райорганізацыя сваячасова распачала падрыхтоўку да зімовай політвучобы. 5 кастрычніка адбылася раённая нарада актыву. У ячэйкі адразу былі накіраваны брыгады па праверцы політмінімуму і для дапамогі падрыхтавацца да зімовай політвучобы.

Трэба падкрэсьліць, што мясцовае аддзяленьне ДВБ зрывае забясьпечаньне школы падручнікамі. Яшчэ месяц таму назад дадзена заяўка на літаратуру, якую і па сёньня не атрымалі.

Хвойка.

Ельскі РК не клапоціцца аб політвучобе

У Ельскім раёне 38 колгасных комсамольскіх ячэек, значная частка іх новаорганізаваныя. Аднак, політвучоба ў організацыі за ўвесь летні час ня была разгорнута. Ніводная ячэйка не прапрацоўвала політмінімуму.

Дрэнна і з падрыхтоўкаю да зімовай політвучобы: райком комсамолу яшчэ не распрацаваў плян організацыі політшкол, не паклапаціўся аб падручніках і кадрах.

Ц. Р.

Рэалізуем указаньні тав. Сталіна

Сёньня слова мае Гомель

Трымайце раўненьне па „Пролетарыю" і Гомсельмашы

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне пляну зборкі і выпуску машын

БОЛЬШ УВАГІ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫМ БРЫГАДАМ

Кіраваць па-новаму

(Гомсельмаш)

На адным з буйнейшых прадпрыемстваў БССР—Гомсельмашы, у жніўні організавалася гаспадарча-разрахунковая брыгада мэханічнага цэху. Першае, з чаго мы пачалі,—гаворыць кіраўнік брыгады,—гэта ўвялі суровую адказнасьць і кантроль за інструмантам і варштатам. Кожны рабочы нясе пэрсанальную адказнасьць за тое, што яму даручана.

У выніку брыгада зэкономіла на інструманце за два месяцы 127 руб. Дзякуючы сьвядомасьці і адказнасьці за работу, ашчадным адносінам да абсталяваньня, колькасьць браку ў брыгадзе рэзка пашла ўніз.

Так, у жніўні брыгада зьнізіла брак да 1 проц. замест плянавых 3 проц. У верасьні процант браку быў зьніжаны да 0,8 проц. Па ініцыятыве ўдзельнікаў брыгады былі высунуты сустрэчныя пляны надборкі машын. Ударнік Кеплін узяў на сябе абавязак зьбіраць замест 15 машын 24. Гэтую норму выконвае па-баявому.

Кожны ўдзельнік брыгады ведае, што ён павінен зрабіць заўтра. Для кожнага ёсьць сутачнае заданьне і заданьне на месяц.

Бязумоўна, у працы брыгады ёсьць і свае недахопы. З боку гаспадарчых організацый заводу не адчуваецца дапамога брыгадзе. Брыгада працуе дрэнным старым інструмантам і гэта адмоўна адбіваецца на выкананьні прамфінпляну. Адміністрацыя аб гэтым ведае, але ніякіх мер ня прымае. Заводзкі камітэт заслухаў даклад аб рабоце брыгады, але конкрэтных захадаў палепшыць умовы ня прыняў. Бюро комсамольскага колектыву за 2 з паловай месяцы існаваньня і працы брыгады не заслухала ні разу яе інформацыі, ня дало ёй патрэбнага кіраўніцтва.

Гэроічныя будні брыгады не пераносяцца ў астатнія цэхі.

Трэба пакласьці канец безадказнасьці і абязьлічкі ў кіраўніцтве брыгадамі. Комсамольская організацыя заводу пры дапамозе гарадзкога камітэту павінна дабіцца карэннага пералому ў становішчы кіраўніцтва працай брыгад.

Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на організацыю тэхнічнай вучобы і стварэньне такіх умоў, пры якіх быў-бы забясьпечан стымул далейшага павышэньня прадукцыйнасьці працы і палепшаньня якасьці продукцыі.

Гаспадарча-разрахунковым брыгадам патрэбна кіраўніцтва па-новаму.

А. Быхаўскі

Мацаваць заваяваныя позыцыі

Брыгада па зборцы лябёдак Гомельскага машына-будаўнічага заводу „Пролетары" першай перайшла на гаспадарчы разрахунак. Вось ужо другі месяц, як яна працуе пры новых умовах. Гэтыя два месяцы далі вялікія дасягненьні ў працы брыгады, аб чым варта расказаць.

Першай справай брыгада дабілася поўнай ліквідацыі абязьлічкі ў галіне інструмантаў і варштатаў. Зараз кожны член брыгады мае сваю скрынку для хаваньня інструмантаў, за які ён адказвае (раней за ўсе інструманты адказвала цалкам уся брыгада).

Гэта перабудова значна адбілася і на экономіі матар'ялаў. Брыгада павінна была за месяц выдаткаваць дзесяць кілё тавоту, а затрачана 5 кілё, замест 3 кілё атрапак затрачана адно кілё. Метчыкі трох восьмых павінны быць у рабоце адзін месяц, а ўдарнік гэтай брыгады тав. Селязьнёў працаваў з імі 2 месяцы.

Брыгада з кожным днём заваёўвае перадавыя позыцыі ў выкананьні прамфінпляну, як колькасна так і якасна. Трэба адзначыць, што члены брыгады прымаюць актыўны ўдзел у працы вытворчых нарад, выпуску насьценгазэт і г. д.

З 20 кастрычніка брыгада перайшла на індувідуальную зьдзельшчыну. З першага-ж дня пераход даў добрыя вынікі: Замест 8 падшыпнікаў было зроблена 9.

Асноўны недахоп—дрэнная праца цэхавай бухгальтэрыі, якая не забясьпечвае належных умоў для працы брыгады.

В. Зэльманаў.

Комсамол—на штурм фінпляну 4-га кварталу

Да 14 гадавіны Кастрычніка рапартаваць выкананьнем фінпляну

(З пастановы сакратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 13-Х—31 г.).

Прапанаваць усім РК КСМ неадкладна ўключыцца ў правядзеньне фінэстафэты, вылучыўшы ў штабы, якія організуюцца ў раёнах па кіраўніцтву эстафэтай, прадстаўніка РК. Задачай эстафэты для КСМ лічыць:

1. У галіне пазыкі—100 проц. афармленьне зробленай падпіскі па пазыцы грашовымі ўзносамі, 100 проц. ахоп падпіскай на пазыку колгасьнікаў і аднаасобнікаў, поўны ахоп падпіскай на пазыку застаўшыхся груп рабочых і служачых.

2. У галіне ашчадсправы—поўнае разгортваньне сеткі ашчадкас на 31 г., 100 проц. уцягненьне працоўных укладчыкамі ашчадкас, выкананьне ў кастрычніку м-цы ня менш 75 проц. пляну 4-га кварталу на фізычных укладах.

3. У зьвязку з фінэстафэтай разгарнуць працу комсамольскай організацыі ў выкананьне соцдагавору ЦК ЛКСМБ з ЦК ЛКСМУ, дабіваючыся выкананьня кожнай ячэйкаю вызначаных кантрольных лічбаў і намечаных агітмасавых мерапрыемстваў у галіне разьвіцьця ашчадсправы і рэалізацыі дзяржпазыкі.

4. Да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі рапартаваць РК ЛКСМБ аб дасягненьнях комсамольскай організацыі на фронце барацьбы комсамолу за выкананьне фінпляну, разам з гэтым выявіць лепшых комсамольцаў барацьбітоў за фінплян з мэтай іх прэміяваньня, прадставіўшы кандыдатуры ў ЦК.

Перавыкананьне фінпляну—наш рапарт

Рымарная фабрыка „1-га Мая" (Менск), правёўшы масавую працу сярод рабочых, уключылася ў фінансавую эстафэту. На цэхавых сходах рабочых вызначаны плян практычнага ўдзелу кожнага рабочага ў фінансавай эстафэце.

Дзейную ролю ў фінэстафэце прымаюць насьценныя газэты.

Праведзена шырокая растлумачальная работа. Зараз мы маем ужо значны зрух у галіне выкананьня фінпляну. Ашчадкаса налічвае 415 укладчыкаў. Укладаў павялічылася на 2893 руб., укладчыкаў—на 115 чал. Гэта зн., што за апошнія дзьве дэкады квартальны фінплян у 2000 руб. выканан на 146,3 проц.

Заданьне рэалізацыі пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі „перавыканана. Рабочыя фабрыкі падпісаліся на 37205 руб., а ў час фінэстафэты дадаткова падпісаліся 140 чал. на суму 9000 р.

За актыўны ўдзел у фінансавай эстафэце прэміявана першая стужка, за 100 проц ахоп рабочых ашчадкасаю прэміяваны: т. Айнбіндэр на 100 р., Каждан і Каплан на 75 руб.

Да 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі рымарная фабрыка будзе рапартаваць аб выкананьні і перавыкананьні фінансавага пляну ў сябе і аб дзейнай дапамозе ф-цы „8-ае сакавіка" у ліквідацыі фінансавага прарыву.

Д. Розман.

Полаччына адстае

Мобілізацыя сродкаў у Полаччыне праводзіцца яўна нездавальняюча. На 10-е кастрычніка паступіла ўсяго 9,1 проц. квартальнага заданьня, альбо 25,1 проц. месячнага.

Ганебна адстаюць дзяржбанк і ашчадкасы, якія не пераключыліся яшчэ на ўдарныя рэйкі ў афармленьні плацяжоў „3-га рашаючага".

Месячны плян па пазыцы выканан толькі на 26,6 проц.

Толькі адзін колгас „Кастрычнік" Юравіцкага с-савету ўнёс 60 проц. пазыкі.

Райком ЛКСМБ стаіць у баку фінансавага пляну. З пуцёўкаю ЦК ЛКСМБ неабходна ўключыцца ў правядзеньне фінансавай эстафэты.

Пятро Прыгожы.

Комсамол, у барацьбу за плян 4 году пяцігодкі

Сёньня зьмяшчаем адкрыты ліст комсамольскай ячэйкі Дзяржпляну БССР да ўсіх комсамольскіх ячэек наркаматаў і ведамстваў, аб шэфстве над складаньнем пляну 1932 году і другой пяцігодкі.

Узяць кожную галіну працы па пляніраваньню пад пільны комсамольскі кантроль—такава задача.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" чакае адказу ад ячэек наркаматаў і ведамстваў на выклік дзяржплянаўцаў.

(Адкрыты ліст комсамольскай організацыі Дзяржпляну ячэйкам наркоматаў і ведамстваў)

Ва ўмовах пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва, калі справа пляніраваньня зьяўляецца справаю мільёнаў працоўных мас, калі праз пляніраваньне мы змагаемся за пасьпяховае выкананьне пляну бальшавіцкай пяцігодкі, на нас комсамольцаў—штаб соцыялістычнага пляніраваньня—кладзецца адказная задача.

Лёзунг: „ударнік першай пяцігодкі і плянавік другой"—павінен быць выкананы.

Узмацненьне аўладаньне тэхнікай пляніраваньня, барацьба за сваечасовае складаньне пляну, за іх якасьць, за апэрацыйнасьць і конкрэтнасьць у гэтай працы на падставе ўказаньняў тав. Сталіна, павінна быць баявой задачай ў складаньні народна-гаспадарчага пляну 1932 году і другой пяцігодкі.

СНК БССР устанавіў пэўныя тэрміны здачы матар'ялаў. Наш абавязак гэтыя тэрміны забясьпечыць.

Становішча на сёньняшні дзень б'е трывогу. Незваротныя наркоматы не прадстаўлялі матар'ялаў да вызначанага тэрміну. Організацыя працы па складаньню пляну выклікае трывогу за іх якасьць (напрацоўка якасных паказчыкаў, натуралізацыя пляну і г. д.).

З мэтай забясьпечыць сваечасовую і якасную прапрацоўку матар'ялаў пляну 1932 году, комсамольскі колектыў Дзяржпляну аб'явіў масавы нік выбарчага паходу. Але без уключэньня ў гэты паход КСМ астатніх частак плянавай сыстэмы, мы ня здолеем выканаць узятыя на сябе абавязкі. Вось чаму ячэйка Дзяржпляну зварочваецца да ўсіх комсамольскіх ячэек з наступнай прапановай.

Усім комсамольскім ячэйкам узяць шэфства над складаньнем пляну 1932 году, пры гэтым дамагацца каб кожная галіна працы апарату над плянам 1932 году была на вучоце, пад пільным вокам комсамольскага кантролю.

Мы павінны забясьпечыць організацыю злагаджанага, скразнога комсамольскага кантролю над складаньнем пляну, што дасьць магчымасьць сваечасова выкрываць усе слабыя вучасткі нашага пляніраваньня.

Комсамольская організацыя Дзяржпляну непасрэдна ўключылася ў выбарчы паход. Створана 8 комсамольскіх пастоў на ўсіх вузлавых вучастках працы, пры якіх кожны дзень будуць выходзіць комсамольскі бюлетэнь і г. д.

Мы ўпэўнены, што ячэйкі наркоматаў і ведамстваў наследуюць прыклад організацыі Дзяржпляну і не дапусьцяць ніводнага зрыву ў справе здачы плянаў, выявяць лепшых камсамольцаў змагароў на фронце соцыялістычнага пляніраваньня.

Бюро плянавай ячэйкі Дзяржпляну БССР.

УЧОРА ў рэдакцыі „Чырвонай Зьмены", на нарадзе аб становішчы складаньня пляну народнай гаспадаркі на 1932 г. высьветлілася пагроза, што плян 1932 г. к тэрміну, вызначанага ўрадам, можа быць прадстаўлены з-за адсутнасьці матар'ялаў асобных наркоматаў і ўстаноў.

А таму Менгарком ЛКСМБ прапануе ўсім колектывам і ячэйкам КСМ сёньня ж правесьці нечарговыя сходы па ўсіх наркоматах і ўстановах ад якіх залежыць складаньне пляну, на пытаньню аб прычынах непрадстаўленьня матар'ялаў і конкрэтных мерапрыемствах па забесьпячэньню прадстаўленьня матар'ялаў да вызначанага тэрміну.

Усім вытворчым шэфствуючым колектывам наладзіць налёт на падшэфныя ўстановы па пытаньню складаньня пляну на 1932 г. Скласьці ва ўсіх наркоматах і ўстановах кантрольныя пасты для агляду за ходам прадстаўленьня і афармленьня неабходных матар'ялаў.

Заг. масава-вытворчым аддзелам Менгаркому ЛКСМБ Хэйман

Комсамольскі суботнік барацьбы з бездарожжам

Чыноўнікі крадуць посьпехі барацьбы з бездарожжам

Колгасцэнтр і Трактарацэнтр не дапамагаюць у правядзеньні суботніка штурму бездарожжа

Вось ужо трэці дзень, як ЛКСМБ праводзіць суботнік па барацьбе з бездарожжам. Аднак, такія організацыі, як Колгасцэнтр і Трактарцэнтр ня ўключыліся у суботнік, не садзейнічаюць пасьпяховаму правядзеньню яго.

Мы штодня падаем матар'ялы, якія гавораць аб тым, што рад райколгассаюзаў зрывае забясьпечаньне рабсілаю дарожнага будаўніцтва, але гэта не хвалюе Колгасцэнтр. Ня гледзячы на такі прарыў, Колгасцэнтр ня лічыць патрэбным праверыць выкананьне свайго „Палажэньня аб парадаку прыцягненьня колгасаў да шляховабудаўнічых работ па БССР".

Трактарцэнтр у барацьбе з бездарожжам абмежаваўся суцэльным маўчаньнем.

Мы патрабуем каб Колгасцэнтр даў конкрэтныя ўказаньні колгасам і саўгасам, а Трактарцэнтр—МТС, аб уключэньні іх у організацыю і пасьпяховае правядзеньне ўсебеларускага комсамольскага суботніка па барацьбе з бездарожжам.

Кіраўніцтва адстае, а тэмпы .. ў загоне

Рамонт і будаўніцтва дарог па Бягомльскім раёне ганебна зрываюцца. Плян выкапан усяго на 80 проц.

Такі прарыў на дарбудаўніцтве здарыўся таму, што партыйныя і комсамольскія організацыі раёну сваячасова не мобілізавалі масы працоўных на выкананьне дарпляну.

З свайго боку райколгассаюз ня даў конкрэтных указаньняў колгасам аб пасылцы рабсілы на будаўніцтва і рамонт дарог. Колгасьнікі па ўсім раёне скарыстаны толькі на 12%. Зрывае забясьпечаньне рабочых дарбуду і райкоопсаюз. У выніку, цесьляры пакідаюць працу.

Мы патрабуем, каб райколгассаюз тэрмінова даў указаньні колгасам аб высылцы рабсілы, распрацаваў конкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу саўгасаў і колгасаў раёну ў будаўніцтве і рамонце дарог.

Бу-ін

Будуюць дарогу

У ліку першых

Уключаючыся ва ўсебеларускі суботнік барацьбы з бездарожжам, Сіроцінскі РК ЛКСМБ даў рашучы адпор опортуністычнай недаацэнцы дарожнага будаўніцтва, якая мела месца ў радох організацыі.

Адначасна РК мобілізаваў 100 лепшых ударнікаў-комсамольцаў на дарожнае будаўніцтва Мобілізаваныя абавязаліся стаць на будаўніцтве першымі ўдарнікамі ў ліквідацыі прарыву.

Шэдзько

Няма адказнасьці за будаўніцтва дарогі

Шклоўскі Райком ЛКСМБ опортуністычна адносіцца да рамонту і будаўніцтва дарог. У раёне дзейнасьці кожнай комсамольскай ячэйкі шмат непраезных дарог. Масты на дарогах разбураны, рамонту ня бачылі некальні год.

Нават у горадзе Шклове дарога будуецца два гады і ніхто ня ведае калі яна будзе скончана. Адказнасьці за будаўніцтва дарогі ніхто не нясе.

Комсамольскія ячэйкі гораду не дапамагаюць хутчэй закончыць дарогу, каб забясьпечыць добры праезд у горад. Кіраўніцтва райкому на гэта не зьвяртае ўвагі.

Юр. Загорскі

Моваю 3-х дописаў

Калі хітра прыкрадваецца абязьлічка...

Гэтыя тры дописы пошта прынесла ў адзін дзень.

Тры дописы. Кожны з іх падмацоўвае другі і разам яны апавядаюць аб нечым нечаканым і дзіўным.

Зусім нядаўна „Чырвоная Зьмена" пісала аб геройчных буднях 8-й комсамольскай істужкі Віцебскай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі". Гэта істужка, дзякуючы правільнай арганізацыі работ, дабілася такіх паказчыкаў, якіх да гэтага часу не ведала фабрыка і ўся швейная прамысловасьць. Яна здолела правільна сумясьціць тэмпы плюс якасьць, з гонарам на працягу доўгага часу несьці ўзьняты штандар ударніцтва.

Не дарма Цэнтральны камітэт комсамолу ў сваёй пастанове хадайнічаў аб узнагародзе істужкі орденам працоўнага сьцягу, як лепшай з лепшых, як прыкладной, геройчнай.

І раптам... тры дописы.

Наперш аб двух з іх. Адзін допіс чырвонашвейнаўскай брыгады ў складзе т. т. Усыскіна і Ваўчка пад назвай „Б'ем трывогу". Другі допіс чырвонашвейнаўскай брыгады ў складзе т. т. Сандлера і Каждуніна за тлумачыць назву першага: „8-я комсамольская істужка Віцебскай фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі", прадстаўленая да ордэну чырвонага сьцягу ганебна вядзе пошыцьцё".

І далей мы чытаем, што за першую дэкаду кастрычніка брыгада выканала прамфінплян толькі на 92 проц., не дадаўшы краіне 486 пар брук. Прарыў здарыўся таму, што ў брыгаду ўліліся шмат новых комсамольцаў, таварышы з багатым вопытам пакінулі працу і былі пасланы на вучобу, на кіраўнічую працу.

Фабзавучнікам не дапамагаюць у іх рабоце, не даюць неабходнага рэзэрву і машын.

Значна занепала дысцыпліна; абязьлічка хітра прыкрадваецца ў цэхі і не сустракае патрэбнага адпору. Інжынэрнікі мінуцца падараваць працу ударнай істужкі.

Аб усім гэтым мы даведваемся з першых двух дописаў.

Трэці допіс таварышоў Усыскіна і Ваўчка мае некалькі іншы характар. Ён сьведчыць аб тым, што „самацёк і абязьлічка прывялі да прарыву".

У гэтым дописе яны гавораць аб становішчы 4-й групы пінжачнай істужкі той-жа фабрыкі. „Прарыў вялік,—недадана звыш тысячы адзінак, у групе пануе самацёк, партыйная і прафсаюзная работа пастаўлена дрэнна. Соцыялістычнае спаборніцтва праводзіцца слаба. Рабочы не ведае колькі яму неабходна зрабіць за зьмену. Пашыраны спэцыяльны ляжаць без руху, і ніхто на гэта не зьвяртае ўвагі. Абязьлічка — верны спадарожнік прарыву—сустрэў тут добрых прыхільнікаў".

Аб гэтым сьведчаць 3 дописы.

Дописы сьведчаць аб ганебным, недапушчальным прарыве.


Мы поўнасьцю згодны з таварышамі Ваўчком і Усыскіным: 8-я комсамольская істужка не павінна дапусьціць прарыву. Ганебная пляма кладзецца на ўсю комсамолію фабрыкі. Прарыў павінен быць ліквідаваны. Комсамольская арганізацыя істужкі павінна неадкладна мобілізавацца на ліквідацыю прарыву і вывесьці з гэторыі 8-й істужкі лічбы ганебных прарываў".

Мы цалкам згодны з таварышамі. Прарыў у 8-й істужцы—вынік блізкага суседзтва абязьлічкі, ураўнілаўкі, адсутнасьць сыстэматычнага і дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва, адсутнасьць барацьбы за падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў.

Урок 8-й істужкі павінен паслужыць папярэджаньнем і для ўсіх брыгад. Ня спыняцца на посьпехах, замацоўваць іх, штодзённа змагацца за далейшае палепшаньне працы—у гэтым задача. І там, дзе з гэтай задачай не спраўляюцца, там—прарыў.

Віцебскі гарадзкі камітэт комсамолу павінен заняцца становішчам істужкі, кінуць на гэты вучастак лепшых комсамольцаў з тым, каб узьняць з гонарам штандар ударніцтва ня высьлізгу ў руз.

Л. Глезэр.



Зьлёт юнкораў Менску
20 кастрычніка 1931 г.

Рэалізацыі пуцёўкі Сталіна—бальшавіцкія тэмпы

З пастановы зьлёту юнкораў гораду Менску па дакладу тав. Глезэра аб рэалізацыі сталінскай пуцёўкі і задачах юнкораў

Зьлёт юнкораў г. Менску адзначае, што менская юнкорыя яшчэ слаба ўключылася ў рэалізацыю сталінскай пуцёўкі. У сувязі з гэтым, зьлёт цалкам уключаецца ў гэту работу і заклікае ўсіх юнкораў Савецкай Беларусі пасьледаваць сваёму прыкладу.

Сталінская пуцёўка—гэта баявая програма для ўсяго комсамолу і кожнага комсамольца паасобку; юнкораўская армія павінна змагацца за найхутчэйшае давядзеньне пуцёўкі да кожнага комсамольца, прасоўваньне яе ў масы працоўнае моладзі;

2. Адзначаючы слабае кіраўніцтва юнкораўскім рухам з боку рэдакцыі газэты „Чырвоная зьмена", зьлёт лічыць неабходным узмацніць кіраўніцтва, орыентуючыся ва ўсей рабоце на ўдарныя брыгады друку, як асноўнае зьвяно юнкораўскага руху.

3. Рашэньні рабсельвкораўскага зьезду не знайшлі конкрэтнага праламленьня ва ўсёй рабоце менскай комсамоліі.

Менгарком ЛКСМБ нездавальняюча кіраваў разгортваньнем работы па рэалізацыі рашэньняў рабсельвсенькораўскага зьезду. Юнкораўская работы яшчэ ня стала неадрыўнаю часткай усёй комсамольскай работы.

Зьлёт лічыць, што Менгарком ЛКСМБ, рэдакцыя газэты „Чырвоная зьмена" павінны неадкладна разгарнуць работу ў галіне рэалізацыі рашэньняў рабсельвкораўскага зьезду, барацьбы за рэалізацыю сталінскай пуцёўкі і палепшаньня ў сувязі з гэтым масавай работы з юнкорамі.

4. Зьлёт бярэ на сябе абавязак разгарнуць падрыхтоўку да пленуму ЦК КП(б)Б ЦК ЛКСМБ з тым, каб да гэтага пленуму прынесьці рапарты сваіх дасягненьняў у галіне барацьбы за транспорт, за новую школу, за соцыялістычную жывёлагадоўлю.

5. Зьлёт лічыць неабходным склікаць асобныя кустовыя зьлёты па асобных галін прамысловасьці з тым, каб на гэтых зьлётах вызначыць задачы юнкораўскай работы, выходзячы з конкрэтных умоў данай вытворчасьці.

6. Газэты „Чырвоная зьмена", „Юнгер Арбэйтэр", а таксама шматтыражк павінны разгарнуць работу па перадачы лепшага вопыту ў галіне рэалізацыі сталінскай пуцёўкі і асьвятленьня ходу гэтай работы.

„Чырвоная Зьмена" ДАПАМАГЛА

Па заметкам юнкора аб настаўніцы Ленінскай сямігодкі (Слуцкі раён) т. Міньковай, якая застрашвала вучняў за зьмяшчэньне на яе матар'ялу ў насьценгазэце, горацкі інспэктар Нарасьветы паведамляе нам, што факты, указаныя ў заметцы, пацьвердзіліся. Настаўніца Міньковa з працы зьнята

* * *

Сіроцінскі РК КП(б)Б паведамляе што юнкораўская заметка „Злачынства" пасьля расьледваньня поўнасьцю пацьвердзілася. Старшыня колгасу з працы зьняты і аддадзены пад суд за безгаспадарчасьць, таксама зьняты з працы нарыхтоўшчык крэдытнага таварыства.

* * *

Койданаўская Рай КК РСІ паведамляе, што заметка „Кіраўніцтва Крупіцкага сельсавету далёка ад клясавай барацьбы, а блізка да кулацтва", у якой указвалася аб нападзе кулака Сьвірыдовіча А. на члена сельсавету комсамольца Грамовіча, пацьвердзілася. Сьвірыдовіч аддадзены пад суд. Кулачка Жыдовіч знаходзіцца пад вартай ДПУ за агітацыю супроць колектывізацыі. Койданаўскаму РВК даручана правесьці дэталёвае абсьледваньне працы Крупіцкага сельсавету.

* * *

Лепельскі Райколгассаюз паведамляе, што заметка аб старшыні колгасу „Чырвоная зорка" поўнасьцю пацьвердзілася. Да старшыні колгасу прыняты меры адміністрацыйнага спагнаньня.

* * *

Допіс аб нядбайных і бюрократычных адносінах да спажыўцоў крамніцы стара-дароскай крамы комсамолкі Некрашэвіч, як паведамляе нам Стара-Дарожскі РВК, поўнасьцю пацьвердзіўся.

Некрашэвіч зьнята з працы і атрымала па комсамольскай лініі вымову.

Як паведамляе Лепельская Рай КК РСІ заметка „Да адказнасьці Слáвіна" дзе гаворыцца аб недапушчальна грубых адносінах загадчыка крамы Лесрабкоопу Славіна, пацьвердзілася Пастановай Лепельскай РайКК РСІ Славін з працы зьняты.

* * *

Менскі райколгассаюз, у адказ на заметку „Аздаравіць кіраўніцтва колгасу „Сталіна", паведамляе, што старшыня колгасу з працы зьняты

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

28-га кастрычніка ў піонэр-габінэце Дому Навукі і Тэхнікі адбудзецца агульна-гарадзкі збор важатых баз і груп акцыябрат гор. Менску.

Парадак дня:
1. Вынікі дэкадніка і далейшыя задачы работы акцыябрат.
2. Аб падрыхтоўцы да юбілею часопісу „Іскры Ільіча".

Пачатак збору роўна а 7 гадзіне ўвечары
Гар. бюро ДКО
Рэдакцыя „Іскры Ільіча".

Мінімум патрабаваньняў па гадоўлі цялят

Каб мець добрую высокатаварную карову трэба клапаціцца аб ёй ня толькі тады, калі яна ўжо дарослая, але з першых-жа дзён яе жыцьця. Догляд за будучай каровай пачынаецца яшчэ ў час яе жыцьця ў арганізьме маці.

Цельную карову неабходна добра карміць, дадаючы ёй ў дзень на менш як 0,5 кгр. моцнага корму (высевак) бо зусім зразумела, што цельная карова павінна атрымліваць корм ня толькі для сябе, але і пэўную частку і на цялё.

Трэба памятаць, што ні ў якім разе нельга гнацца за тым, каб даіць карову ад ацёлу да ацёлу. Гэта вельмі дрэнна адбіваецца як на самой карове, так і на цяляці. Да ацёлу карова павінна мець 40-50 дзён адпачынку.

Пры выбары цялят для гадоўлі перш за ўсё трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на іх бацькоў. Ад добрых бацькоў заўсёды ёсьць надзея атрымаць добрае племя. Пакідаць на племя цялят трэба ад кароў з высокімі ўдоямі, даючых тлустае малако і маючых добрую жывую вагу. Ад кароўжа немалочных і мізэрнай жывой вагі пакідаць цялят на племя няма ніякага сэнсу—іх можна гадаваць толькі на мяса.

Вось аб гэтым павінен ведаць кожны, хто займаецца жывёлагадоўляй. Трэба аднак заўважыць, што гэтага правіла ў нас мала хто прытрымліваецца і ў большасьці пакідаюць на племя цялё ад уласнай каровы, хаця-б яна была зусім нікуды ня варта. Аб гэтым асабліва трэба памятаць нашым соцыялістычным гаспадаркам, якія павінны ставіць перад сабой задачу—як найхутчэй палепшыць якасьць нашай жывёлы.

Пасьля ацёлу цялё неабходна выцерці мяккай анучкай і перанесьці яго ў другое стойла. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што цялё ў першыя дні свайго жыцьця вельмі лёгка можа прастудзіцца. Таму неабходна прыняць усе захады да таго, каб захаваць яго ад прастуды.

Ні ў якім разе нельга даваць карове аблізваць цялё, як гэта часта ў нас водзіцца. Таксама ні разу не падпускаць цялё пад карову. Калі мы падпушчаем цялё пад карову, дык гэтым самым псуем і карову і цялё. Карову псуем тым, што цялё не можа высмактаць усяго малака, якое ў першы час маецца ў вымені і гэтым самым псуем яе вымя, а цялё, калі яно знаходзіцца пад каровай, заўсёды выпівае малака больш, чым гэта яму трэба і ад гэтага яно хварэе. Карменьне цяляці пад каровай дапушчаецца толькі ў тых гаспадарках, якія ўт-

Малочнае стада на выгуле

трымаюць жывёлу не для малака, а выключна на мяса (у БССР такіх гаспадарак няма).

Першыя сем-дзесяць дзён пасьля ацёлу, малако каровы мае зусім інакшы склад, чым звычайнае малако. Гэта малако, ці як яго называюць „малодзіва", захоўвае ў сябе ў значнай ступені бялок, як адну з галоўнейшых частак спажыўнага корму для цяляці. Акрамя гэтага ў ім маецца вельмі многа так званых мінэральных соляй (попелу), якія неабходны для цяляці ў першыя дні яго жыцьця. Вось чаму, як правіла, першыя семдзесяць дзён пасьля ацёлу, цяляці неабходна даваць выключна малако маткі.

Паіць цялё трэба сьвежым, цёплым, толькі што выдаеным малаком. У першы дзень даць цяляці гэта малако ў невялікай колькасьці, прыблізна адзін-паўтара літра і разьмеркаваць яго на чатыры пяць разоў. Праз пяць-шэсьць дзён можна перайсьці на трохразовае карменьне. Пачынаючы з першага дня, порцыя малака з кожным днём павінна павялічвацца. Павялічэньне яго залежыць ад ліку малака, вызначанага для цяляці і ад таго тэрміну, у які будзе скормлена гэта малако.

Пры правільным карменьні неабходна, каб цялё атрымлівала на працягу 20 дзён свайго жыцьця ня менш 5 літраў малака ў дзень. Для таго, каб выпаіць добрае цялё, неабходна яму вызначыць на ўвесь час карменьня малаком цэлага малака ня менш 175 літраў і зьнятага малака ня менш 250 літраў. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ад таго, колькі мы скармілі цяляці малака, будзе ў асноўным залежаць і яго гатунак. Аднак, улічваючы вострую патрэбу ў малаку, можна вызначанай колькасьцю цэлага малака абмежавацца пры ўсякай гадоўлі цялят, а павялічваць толькі лік зьнятага малака, бо бялок, які зьяўляецца вельмі каштоўным для маладога організму, цалкам застаецца ў зьнятым малаку разам з усімі астатнімі часткамі, якія ўваходзяць у склад малака, за выключэньнем тлушчы, якое ў зьнятым малаку амаль-што няма.

Пэрыод карменьня цяляці малаком мае ня меншае значэньне, чым лік скормленага малака. У першы час жыцьця цялё патрабуе выключна малака, і замена яго на другі корм бязумоўна адаб'ецца на разьвіцьці цяляці.

Каб выгадаваць добрае цяле трэба даваць яму малодзіва ня менш, як на працягу 30-40 дзён, а зьнятае малако ня менш як да двух з паловай—трох месяцаў жыцьця цяляці. Зьнятае малако пачынаюць даваць з 20-30 дзённага ўзросту. Пераход пры гэтым павінен быць паступовы.

Сутачная норма дачы зьнятага малака цяляці залежыць таксама ад таго пэрыоду, які ўстаноўлены для карменьня зьнятым малаком і ад колькасьці вызначанага на ўвесь пэрыод гэтага малака. Нормальная сутачная дача цяляці зьнятага малака ў паўтарамесячным узросьце не павінна быць ніжэй пяці літраў. Вельмі пажадана прыбаўляць да зьнятага малака патроху адвару змолатага ільнянага семя.

Пры экономіі цэлага малака, альбо адсутнасьці яго неабходна даваць цяляці больш малодзіва з пяці-двухмесячнага ўзросту даюць цяляці пойла (баўтушку). Пойла прыгатаўляецца з цёплай вады з дадаткам аўсянай мукі і ільнянай макухі. Пры карменьні цяляці пойлам трэба мець на ўвазе, што дача вялікай порцыі пойла можа выклікаць расстройства страўніка (панос), таму ня трэба апойваць цялё.

Прывучаюць да пойла цялё паступова. Больш як да трохмесячнага ўзросту пойла даваць не патрэбна. З гэтага часу неабходна прывучаць цялё да сухога корму, г. зн. даваць моцны корм (аўсянку і ільняную макуху) у сухім выглядзе]. Вада пры гэтым даецца чыстая. Моцнага корму ў такім узросьце (тры месяцы) даваць каля 1—1½ кгр.

Асаблівую ўвагу пры выпойваньні цялят трэба зьвярнуць на чыстату пасуды. Ад кепскага ўтрыманьня пасуды ў цяляці зьяўляецца панос, ад чаго яно вельмі хутка дохне.

З 3-месячнага ўзросту трэба пачынаць прывучаць цялят да грубага корму. Каштоўны корм для гэтага ўзросту—маладое добрае мурожнае сена. Вельмі пажадана даваць цялятам у невялікай колькасьці так званыя мінэральныя солі (крэйду, соль, касьцяную муку). Гэта вельмі добра ўмацоўвае косьці цяляці.

Трэба памятаць, што для таго, каб добра разьвіваўся організм цяляці яму неабходна сьвятло, чыстата і сьвежае паветра, без чаго нельга чакаць ад цяляці ў будучым добрай і здаровай каровы, альбо вытворніка.

Вось мінімум прасьцейшых патрабаваньняў, якія, бязумоўна, павінны выконвацца дзеля таго, каб атрымаць добрую, рослую і здаровую карову, альбо вытворніка. Без выкананьня гэтых неабходнейшых умоў мы ня зможам выканаць пастаўленую перад намі задачу—павысіць якасьць нашай малочнай жывёлы.

К. В.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.